ПАДЗЕЯ

# ГІМН ПАМЯЦІ, ЛЮБОВІ І НАДЗЕІ

**Вершамі, музыкай, песнямі, кветкамі і экспромтамі ў Гродне адсвяткавалі Сусветны дзень паэзіі.**

28 сакавіка ў галоўным корпусе Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Карскага было шматлюдна. Тут адбыўся літаратурна-музычны вечар «Дзіўная музыка слоў», прысвечаны Сусветнаму дню паэзіі, які штогод адзначаецца 21 сакавіка.




Сёлета тэматычныя мерапрыемствы праходзілі ва ўсіх раёнах Гродзенскай вобласці. Слонім, Зэльва, Ліда, Смаргонь, Астравец, Ваўкавыск, Карэлічы, Навагрудак – розныя куточкі Прынёмання апошнім часам наведалі члены Саюза пісьменнікаў Беларусі, выступілі са сваім мастацтвам, прэзентавалі ўласныя творы і кнігі, індывідуальныя і калектыўныя выданні. Пра гэта ва ўступным слове паведаміла старшыня ГрАА СПБ, Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь Людміла Антонаўна Кебіч. А зараз дружная літаратурная сям'я Прынёмання – пісьменнікі разам з бібліятэкарамі і чытачамі – сабралася ў галоўнай кніжніцы вобласці на выніковае мерапрыемства, літаратурна-музычны вечар пад назвай «Дзіўная музыка слоў». Свята высокага мастацтва і трывалага сяброўства згуртавала вельмі розных людзей, красамоўна падкрэсліла нашы традыцыйныя каштоўнасці і духоўныя памкненні да іх.

Без чаго немагчыма рухацца па жыцці? Зразумела, без павагі да мінуўшчыны, без памяці. Таму пачалася святочная імпрэза з традыцыйнай, вельмі кранальнай старонкі памяці: прысутныя ўшанавалі хвілінай маўчання сучасных паэтаў Прынёмання, якія пайшлі з жыцця.



Удзельнікамі літаратурна-музычнага свята сталі прадстаўнікі розных пакаленняў, члены Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэты: Людміла Кебіч, Браніслаў Ермашкевіч, Дзмітрый Радзівончык, Ганна Скаржынская-Савіцкая, Тамара Мазур, Вікторыя Смолка, а таксама кандыдаты ў шэрагі СПБ Ірына Салата і Вольга Алізар. Акрамя вершаў, паэты Андрэй Татур і Анатоль Апанасевіч падарылі аўдыторыі лірычныя песні ўласнага сачынення пад гітарны акампанемент. Без чаго немагчыма натхненне на творчасць і мірную працу? Зразумела, без любові, без кахання, без шчасця ў жыцці. Таму пераважна гэтымі матывамі аўтары напоўнілі агучаныя радкі і думкі. Закранулі тэму вайны, Перамогі, вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У фінале імпрэзы яе вядучая Вікторыя Саковіч па традыцыі абвясціла «свабодны мікрафон», – магчымасць выступіць, прадэманстраваць свае творчыя здольнасці атрымалі ўсе жадаючыя – спевакі, музыкі, грамадскія актывісты. Прагучала шмат па-сяброўску добрых і цёплых слоў. З Сусветным днём паэзіі ўдзельнікаў і гасцей свята сардэчна павіншавала дырэктар Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Карскага Марына Эдвардаўна Ігнатовіч. Інструменталіст, музычны педагог з Гімназіі № 5 імя У. Караткевіча Марына Лаўрык выканала некалькі эфектных музычных кампазіцый на акардэоне. На тварах людзей успыхнулі усмешкі. На душы ва ўсіх стала цёпла і лёгка. Стала зразумела, без чаго немагчыма ўявіць паўнавартаснае жыццё – без надзеі на лепшае, якую дорыць неўміручая іскра творчасці.

САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ
ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ

На фота: незабыўныя моманты абласнога свята паэзіі пад назвай «Дзіўная музыка слоў». Галоўны корпус Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Карскага. 28 сакавіка 2025 года.



Вядучая літаратурна-музычнага свята Вікторыя Саковіч



Вельмі важна, калі такія мерапрыемствы наведвае моладзь




Прывітальнае слова ад Людмілы Антонаўны Кебіч



Член СПБ, паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык




Ветэран літаратурнага руху, патрыярх паэзіі Прынёмання Браніслаў Ермашкевіч



Член СПБ, паэт, аўтар і выканаўца песень Анатоль Апанасевіч


Кандыдат у шэрагі СПБ, маладая гродзенская паэтэса Вольга Алізар







Член СПБ, паэтэса, публіцыст Тамара Мазур



Член СПБ, паэт, публіцыст, аўтар і выканаўца песень Андрэй Татур






Член СПБ, дзіцячая пісьменніца Ганна Скаржынская-Савіцкая




Член СПБ, паэтэса Вікторыя Смолка




Музычны падарунак ад Марыны Лаўрык


СВАЕЙ КРАІНАЙ
ЗНАК ЯКАСЦІ
ЗРОБЛЕНА Ў БЕЛАРУСІ


МЫ ГАНАРЫМСЯ СВАЕЙ КРАІНАЙ
ЗРОБЛЕНА Ў БЕЛАРУСІ






У дадатак да музычнага – падарунак паэтычны, уласнага сачынення!



Людміла Антонаўна выступіла з прэм’ерай новых вершаў








Кветкі ад шчырага сэрца прыхільніка




Віншаванне паэтам ад празаіка, кандыдата ў шэрагі СПБ, аўтара 10 кніг Ірыны Салаты



Нечаканы, але прыемны творчы экспромт



Віншаванне з Сусветным днём паэзіі ад дырэктара ГАНБ імя Я. Карскага Марыны Эдвардаўны Ігнатовіч







Да новых творчых сустрэч!

***Фота*** Алесі Касмоўскай